ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# Настаўніцкая газета
9 красавіка 2011 года




Рэктар БДАТУ М.У.Казаравец, міністр адукацыі С.А.Маскевіч і дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў В.В.Баляба.

**З 5 па 7 красавіка ў сталіцы на спартыўнай базе Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта прайшлі фінальныя спаборніцтвы рэспубліканскай універсіяды па грэка-рымскай барацьбе. Удзел у іх прынялі 122 спартсмены з 22 вышэйшых навучальных устаноў краіны, сярод якіх былі прадстаўнікі не толькі спартыўных універсітэтаў, але і, напрыклад, Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.**

# Грэка-рымская барацьба: задачы дзве, мэта адна



Асаблівасцю менавіта гэтых спартыўных паядынкаў рэспубліканскай універсіяды стала тое, што на іх прысутнічала шмат ганаровых гасцей, сярод якіх міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Аляксандравіч Маскевіч, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Валянціна Віктараўна Баляба, выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі барацьбы чэмпіён свету Мікалай Віктаравіч Палазнік. Не абмінулі ўвагай спаборніцтвы і вядомыя спартсмены нашай краіны, якія ў свой час паспяхова спалучалі вучобу ў ВНУ з заняткамі спортам, дасягнуўшы пры гэтым высокіх вынікаў у розных відах спорту. Гэта алімпійскія чэмпіёны — выпускнік Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта Леанід Тараненка (цяжкая атлетыка) і выпускнік БДУ Камандар Маджыдаў (грэка-рымская барацьба).

— Не так даўно, падводзячы вынікі ўдзелу беларускіх спартсменаў у сусветнай універсіядзе, мы ў чарговы раз прыйшлі да высновы, што поспехі краіны на буйных міжнародных спаборніцтвах не магчымы без масавага спорту, асабліва ў студэнцкім асяроддзі, — адзначыў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч. — Я ўпэўнены, што кожны з тых, хто прымае ўдзел у рэспубліканскай універсіядзе, годны не толькі прадстаўляць і абараняць гонар сваёй навучальнай установы, але і ўвогуле звацца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь.

Дарэчы, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт невыпадкова стаў гаспадаром рэспубліканскіх спаборніцтваў. БДАТУ з'яўляецца вядучай ВНУ краіны па падрыхтоўцы інжынерных кадраў для аграпрамысловага комплексу. За сваю 55-гадовую гісторыю са сцен гэтай навучальнай установы выйшла больш як сорак тысяч кваліфікаваных спецыялістаў. Ва ўніверсітэце вялікую ўвагу ўдзяляюць таксама развіццю фізічнай культуры. Кафедра фізвыхавання і спорту, спартыўны клуб вядуць вялікую работу па стварэнні спрыяльных умоў для спалучэння заняткаў фізічнай культурай, спорту і вучэбнай дзейнасці. Ва ўніверсітэце створана сучасная спартыўная база, якая дазваляе на высокім узроўні праводзіць вучэбна-трэніровачны працэс і спаборніцтвы па розных відах спорту, працуюць спартыўныя аддзяленні па 20 відах спорту. Рэгулярна праводзяцца круглагадовыя спартакіяды сярод груп і факультэтаў, а таксама сярод работнікаў універсітэта. Толькі за апошніх пяць гадоў універсітэт падрыхтаваў 23 майстры спорту і 5 майстроў спорту міжнароднага класа. Яго гордасцю з'яўляюцца студэнты-спартсмены, пераможцы буйных спаборніцтваў: алімпійскі чэмпіён, неаднаразовы чэмпіён свету і Еўропы па цяжкай атлетыцы Леанід Тараненка, чэмпіён свету па сучасным пяцібор'і Міхаіл Пракапенка, чэмпіён свету па тайландскім боксе Марат Азярбіеў, уладальнік кубка Рэспублікі Беларусь па боксе Ілья Грыб, чэмпіён Беларусі па грэка-рымскай барацьбе Дзяніс Капусцінскі і многія іншыя.

— БДАТУ па праву лічыцца кузняй кадраў для аграрна-прамысловага комплексу нашай краіны. Прычым са сцен гэтага ўніверсітэта выходзяць выдатныя спецыялісты, якія валодаюць не толькі грунтоўнымі ведамі, але і маюць цудоўную фізічную падрыхтоўку.

►►► 2 стар.

◄◄◄ 1 стар.

Сам за сябе кажа той факт, што шэсць студэнтаў БДАТУ ўваходзяць у асноўны і рэзервовы склад нацыянальных каманд па розных відах спорту, прычым прафесійны спорт яны ўдала спалучаюць з заняткамі ва ўніверсітэце, — гаворыць Валянціна Віктараўна Баляба. — Дзякуючы намаганням усіх працаўнікоў гэтай ВНУ і асабліваму ўкладу рэктара, значна ўзмацнілася спартыўная база ўніверсітэта. Таму я з вялікім задавальненнем уручаю Мікалаю Уладзіміравічу Казараўцу ганаровую грамату Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў "За асабісты ўклад у развіццё і ўдасканаленне фізкультурна-аздараўленчай і спартаўна-масавай работы са студэнтамі".

Такая ж ганаровая грамата была ўручана і "правай руцэ" рэктара ў пытаннях фізічнай культуры і спорту ва ўніверсітэце Уладзіміру Іосіфавічу Шчэрбе. Дарэчы, Уладзімір Іосіфавіч, які быў галоўным суддзёй фінальных спаборніцтваў, з'яўляецца ўладальнікам прыза Міжнароднай федэрацыі барацьбы "Лепшы арбітр свету".

Пераможцы фінальных спаборніцтваў рэспубліканскай універсіяды па грэка-рымскай барацьбе вызначаліся ў сямі вагавых катэгорыях. Імі сталі студэнты Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Андрэй Пікуза (вагавая катэгорыя да 55 кг), БДУФК майстар спорту міжнароднага класа Генадзь Халявіцкі (да 60 кг), БДУ Дзмітрый Аленскі (да 66 кг), БДУФК майстар спорту міжнароднага класа Яўген Бачко (да 74 кг), Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта майстар спорту міжнароднага класа Валерый Паленскі (да 84 кг), БДУФК Мікалай Данілаў (да 96 кг) і Аляксандр Мыцько (да 120 кг).

— Мы нікога не нацэльваем на тое, што пасля рэспубліканскай універсіяды яе пераможцы адразу паедуць на Алімпійскія гульні ці іншыя буйныя спаборніцтвы, — гаворыць Валянціна Віктараўна Баляба. — Цудоўна, калі ўніверсіяда стане прыступкай да гэтага. Але ў тых, хто яе арганізоўвае і праводзіць, іншыя задачы і мэты. У першую чаргу ВНУ краіны павінны падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія, прайшоўшы некалі праз універсіяду, і на сваім працоўным месцы, стаўшы, напрыклад, кіраўнікамі, будуць па-асабліваму ставіцца да фізічнай культуры. Ну а мэта ва ўсіх нас адна — каб людзі з самага ранняга ўзросту ўсведамлялі, што без спорту не можа быць не толькі прыгожага цела, але і прыгожай душы.

**Марына ПЫРКОВА.**
*pyrkova@nastgaz.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**